**Міжнароднае спаборніцтва па еўрапейскім праве**

# THE EUROPEAN LAW MOOT COURT COMPETITION

Студэнты 4-5 курсаў, магістранты і аспіранты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта запрашаюцца да адбору ў каманду для ўдзелу ў буйнейшым міжнародным спаборніцтве па еўрапейскім праве The European Law Moot Court Competition (ELMC).

Удзел у дадзеным спабортніцтве – гэта рэальная мажлівасць палепшыць свае асабістыя і прафейныя якасці, а таксама стаць больш заўважным і канкурэнтаздольным для мэтаў працаўладкавання і далейшага паступлення ў навучальныя ўстановы.

Тэрміны правядзення сёлетняга спаборніцтва: адбор удзельнікаў у каманду – да 17 верасня, рэгістрацыя ўдзельнікаў – да 25 лістапада, пісьмовая частка – да 30 лістапада, вынікі пісьмовай часткі – студзень 2013 г., рэгіянальны фінал – люты 2013 г., фінал – сакавік-красавік 2013 г. З больш падрабязнай інфармацыяй і правіламі спаборніцтва можна азнаёміцца на сайце www.elmc.org і на старонцы facebook www.facebook.com/EuropeanLawMootCourtCompetition.

Патрабаванні да кандыдатаў:

- Валоданне пісьмовай і вуснай англійскай мовай. Валоданне французскай мовай будзе разглядацца ў якасці перавагі;
- Адсутнасць удзелу ў вусных этапах дадзенага спаборніцтва папярэдніх гадоў;
- Імкненне да асабістага і прафесійнага развіцця.

Падрыхтоўку каманды будуць ажыццяўляць былыя ўдзельнікі падобных спаборніцтваў і выкладчыкі БДУ.

Для ўдзелу ў адборы неабходна падрыхтаваць пісьмовы адказ на пытанне 2 абзаца 20 сёлетняй версіі справы, якая знаходзіцца на сайце спаборніцтва. Адказ дасылаецца ў фарматах .doc, .docx, .rtf ці .odt на электронную скрыню elmc.bsu.2013@gmail.com **да 10-00 17.09.2012**. Пасля разгляду дасланых адказаў адбудзецца сустрэча з асобнымі кандыдатамі ў каманду.

Усе пытанні, якія тычацца падрыхтоўкі і ўдзелу, просім адрасаваць на вызначаную вышэй электронную пошту.